# Балота пад грыфам «сакрэтна».

Кожнае балота — невядомая планета, на якой марыць пабываць любы даследчык. Альманскія ж балоты — гэта цэлае сузор'е, якое спрадвеку прываблівала арнітолагаў. Але трапіць туды яны доўгі час не маглі. Знаходзячыся ў цэнтры Палесся на мяжы з Украінай, балоты былі адным з самых сакрэтных мясцін Беларусі.

У савсцкі перыяд на іх тэрыторыі іспаваў авіяцыйны палігон "Палескі" (Мерлінскі). З дваццаці пяці вайсковых палігонаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі рэспублікі, гэты быў самы вялікі, агульная плошча яго складала 127,4 тысячы га.

Абтары Альманскіх балот часта ўзгадваліся ў манаграфіях арнітолагаў М.С Долбіка і А.У. Фядзюшы- на "Птушкі Беларусі" і "Птушкі Палесся". Гэтая акалічнасць яшчэ больш інтрыгавала вучоных і павялічвала жаданне трапіць туды. Штогод з Інстытута заалогіі Акадэміі навук у Беларускую ваенную акругу накіроўвалася афіцыйнае пісьмо з запытам дазволіць яго супраноўнікам даследаваць балотны масіў. Але кожны раз навукоўцы атрымлівалі адмоўны адказ.

Між тым, сабралася ініцыятыўная група заолагаў, якія вырашылі пранлыць па рацэ Сцвіга, якая ўяўляла з сябе натуральную мяжу палігона. Але Альманскія балоты і тут не захацелі адкрываць свае таямніцы. Першая ноч на балоце даследчыкаў уразіла. Яны літаральна папалі на светлавое шоу масіраваных начных нускаў ракет "паветра-зямля" над Колкамі. Наступная ноч прынесла непрыемны сюрпрыз. Была ранняя вясна. Пакуль арнітолагі шукалі соў уначы, сухая трава на выспе, дзе знаходзіўся лагер, загарэлася. Імгнен- на запалаў намёт, у якім спаў адзін з удзельнікаў экспедыцыі. Прачнуўшы ад агню, ён літаральна "вынес" палаючы намёт са спальнікамі і ўсёй амуніцыяй да старыцы ракі. У ваду трапіла каштоўная фотаапаратура, а ў мітусні пажару згарэў спальнік і налова ботаў. Але непрыемнасці на гэтым не скончыліся. Па навукоўцаў прыехала машына ГАЗ-66, у якую загрузілі байдарку і астатнія рэчы, вырашылі заначаваць. Ужо ў поўнай цемры кіроўца хацеў прагрэць машыну і змяніць месца паркоўкі. Так здарылася, што новае, больш "зручнае", месца аказалася ў самой рацэ. Выконваючы гэты "манеўр", грузавік толькі цудам не перакуліўся, але ж усе рэчы з кузава трапілі ў ваду. Нешта патанула, нешта не без цяжкасцей удалося вылавіць...

Праходзілі гады. Вайсковыя таямніцы СССР сталі ўжо набыткам гісторыі, а палігон так і заставаўся недасяжным для даследчыкаў. Што ж, калі нельга прайсці яго па зямлі, то можна паспрабаваць паглядзець на балота з паветра. У 1995 годзе навукоўцы змаглі абляцець Альманскія балоты і паглядзець увесь масіў з вергалёта. Пабачыўшы сцяжынкі, якія цягнуліся ад вострава да вострава, зразумелі: балота не такое ўжо і непраходнае, як гэта надавалася раней. Аблёт даў падставу для правядзення далейшых даследаванняў.

Са з'яўленнем грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Беларусі" (цяпер — "Ахова птушак Бацькаўшчыны") на Альманскія балоты была арганізавана арніталагічная зкспедыцыя, якая ўпершыню адзначыла там гнездаванні вялікага арляца. Як потым выявілася, тут мае прапіску найбуйнейшая групоўка гэтага віду ў Еўропе.



Дзякуючы намаганням арніголагаў і быў створаны заказнік "Альманскія балоты", які ў 1998 годзе быў абвешчаны тэрыторыяй, важнай для птушак, міжнароднага значэння. У 2001 годзе Альманскія балоты атрымалі статус Рамсарскіх угоддзяў.

## Вайсковая спадчына СССР

Хаця вайскоўцы занялі Альманскія балоты яшчэ ў 50-я гады мінулага стагоддзя, тым не менш афіцыйнай датай стварэння

палігона лічыцца 1962 год. Мясцовыя жыхары казалі, што насельнікі Мерленскіх хутароў адмаўляліся нераязджаць з роднага балота ў іншыя куткі краіны. Тады для правядзення “растлумачалыіай работы” да іх прыехаў генерал. Відаць, не знайшоў ён з хутаранамі агульнай мовы, бо ў запале спрэчак, быццам “па неасцярожнасці”, яны разбілі генеральскую машыну. Вось такой была прыхільнасць палешукоў да, здавалася б, гіблых месцаў.

З цягам часу людзей адсялілі, і тэрыторыя цалкам абязлюдзела. Добрую частку балот аддзялілі ад Беларусі і перадалі Украінскай ССР. Вялікі абшар быў аддадзены вайскоўцам, якія праводзілі стрэльбы і ваенныя выпрабаванні. Авіяцыя з года ў год у літаральным сэнсе шпігавала яго свінцом і іншымі элементамі табліцы Мендзялеева. Сярод мясцовых жыхароў хадзілі нават чуткі, што там узрывалі радысактыўныя боепрыпасы невялікай магутнасці.

Больш чым праз паўстагоддзя прыадкрылася адна з таямніц Альманскіх балот. У пачатку 1960-х гадоў па ўсім Палессі пачала працаваць навуковая экспедыцыя, якая вывучала радыяцыйную сітуацыю ў гэтым краі. Праца працягвалася некалькі гадоў. Як сцвярджаюць гіэўныя крыніцы, маштабы даследаванняў па некаторых кірунках пераўзыходзілі нават паслячарнобыльскія. Прапанова навукоўцаў была наступнай: каб спыніць міграцыю радыеактыўных рэчываў па Палессі, трэба правесці мсліярацыю і ўносіць на палеткі дадатковыя ўгнаенні. Фактычна гэтыя рэкамендацыі і падштурхнулі ўлады да правядзення буйнама- штабнай меліярацыі Палескай нізіны. Ужо ў 1966 го- дзе Пленум ЦК КПСС вынес вердыкт: асушыць на беларускім Палессі 2,7 млн гекгараў балот.

## Альманскія скарбы

Мінуў час, і ваенныя сышлі з тэрыторыі палігона. Тут жа пачаліся спробы яго засваення. Хутка з’явіліся меліяратары са сваёй ідэяй асушыць гэты велізарны масіў. Але знайшліся цвярозыя розумы, якія спынілі работы ўжо пасля пачатку. Адзін з першых на абарону Альманскіх балот стаў сябра АПБ Аляксей Дубоўскі. Хоць гэтае рашэнне аб спыненні асушэння далося нялёгка, яно выратавала многія жыцці людзей. Бо ў балоце засталося мноства неразарваных бомбаў і іншых выбуховых рэчываў.

Тым не менш, заказнік “Альманскія балоты” дае прытулак значнай колькасці такіх рэдкіх птушак, як вялікі арлец і арол-вужаед. Агульная колькасць вялікага арляца ў межах заказніка складае 18-20 гняздуючых пар. Для параўнання: ва ўсіх краінах Еўрасаюза ледзь набярэцца 10 нар гэтых птушак.

Спадабаліся Альманскія балоты і барадатай кугакаўцы, хоць яна і аддае перавагу паўночным прасторам. Балотныя абшары забяспечваюць існаванне значнай часткі (10-20%) беларускай папуляцыі гэтай рэдкай савы, якая прадстаўлена, мяркуючы па ўсім, ізаляванай рэліктавай груноўкай на поўдні Беларусі і крайняй поўначы Украіны.

З прычыны вялікай плошчы і цяжкадаступнасці, адсутнасці населеных пунктаў на Альманскіх балотах змаглі захавацца непарушанымі тыповыя для рэгіёна фаўністычныя комплексы. Найболып вывучана зараз арнітафаўна заказніка “Альманскія балоты”, што ўключае 189 відаў птушак, з якіх 131 від даказана гняздуецца тут, для яшчэ 9 гнездаванне мяркуецца і 49 відаў сустракаюцца толькі падчас сезонных міграцый, на зімоўцы або з’яўляюцца выпадкова залётнымі. З ліку гняздуючых 22 віды занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, а двум з іх (вялікаму арляцу і вяртлявай чаротаўцы) пагражае поўнае знікненне. Гэтае багацце нам трэба зберагчы, і Альманскія балоты павінны стаць запаведнікам.

**Мікалай ЧЭРКАС, кандыдат біялагічных навук**

**Фота аўтара**

**Источник:** Родная прырода. — 2015. — №8. — С. 11-13.

